# ПРАДМОВА.

**„Да навукі вядзе не шырокая дарога — і толькі той можа разлічваць дасягнуць яе ззяючых вяршын хто, не баючыся працы, узбіраецца па яе камяністых сцежках".**

**К. Маркс.**

**(З прадмовы да 1-га французскага выдання «Капітала» 1872 г.).**

Вялікі і адказны тыя задачы, якія комуністычная партыя паставіла перад совецкай грамадскасцю ў справе падняцця социялістычнай жывёлагадоўлі на вышыню, якая адпавядае задачам будаўніцтва социялізма.

17-ты з'езд партыі і ліпенскі пленум ЦК ВКП(б) даў разгорнутую праграму дзейнасці ў галіне падняцця жывёлагадоўлі.

Рэалізацыя гэтай праграмы патрабуе паглыблення і падвышэння якасці работы, як ветэрынарна-зоатэхнічных навучальных, так і навукова-даследчых устаноў.

Побач з задачамі падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў социялістычнай жывёлагадоўлі ВНУ разам з навукова-даследчымі ўстановамі і практычнымі працаўнікамі жывёлагадоўчага фронта павінны даць навуковае вырашэнне цэлага шэрагу як тэарэтычных, так і практычных пытанняў рэканструкцыі жывёлагадоўлі.

Без навукова-даследчай работы ВНУ не змогуць выканаць якасна задачы падрыхтоўкі кадраў высокай кваліфікацыі.

ВНУ, якая замыкаецца ў вузка-педагагічную работу, адрываецца ад асугучнага біцця ў унісон з пульсам сучаснай навукі. Толькі актыўны ўдзел у распрацоўцы навуковых праблем актуальных для нашай социялістычнай радзімы і герaічнай эпохі забяспечваюць працаўнікам ВНУ магчымасць знаходжання на ўзроўні сучасных вышынь навукі і тэхнікі.

Задача „Вучоных запісак" Віцебскага Ветэрынарна-Зоатэхнічнага Інстытута, 1-шы том якіх выходзіць ў свет — адабразіць навукова-даследчую работу кафедр, лабараторый і клінік Інстытута, як у сценах Інстытута, так і на вытворчасці ў цесным кантакце з ветэрынарна-зоатэхнічнымі практычнымі працаўнікамі.

Выпуск гэтага 1-га тома супадае з юбілеем 10-годдзя Інстытута, які даў краіне за гэты час 533 ветэрынарных урачэй і 64 зоатэхнікаў.

У бязлітаснай класавай барацьбе, якая асабліва абвострылася ў перыяд поўнай ліквідацыі эксплаататарскіх класаў, і ў ліку навуковых працоўнікоў Інстытута знашліся людзі, якія аказаліся цалкам у лагеры нашых класавых ворагаў.

Наяўнасць класава-чужых і класава-варожых элементаў у навуковым калектыве Віцебскага Ветэрынарна-Зоатэхнічнага Інстытута ў свой час з'явілася значным тормазам, як у справе падрыхтоўкі высокакваліфікаваных кадраў спецыялістаў, так і ў галіне навукова-даследчай і выдавецкай работы.

Выданне навуковых прац Інстытута служыць паказчыкам таго, што навуковы калектыў Інстытута ў абноўленым складзе ўзяўся за актыўнае вырашэнне навуковых праблем і задач у галіне жывёлагадоўлі ў адпаведнасці з нашай совецкай рэчаіснасцю. Многа цяжкасцей маецца на гэтым шляху Адсюль і рад дэфектаў і недахопаў: у шэрагу работ параўнальна невялікі эксперыментальны матэрыял, адсутнасць дастатковага камплексавання навуковых работ паміж асобнымі кафедрамі, многатэмнасць навукова-даследчай работы ўсяго Інстытута ў цэлым.

Рэдакцыйная калегія спадзяецца, што ў працэсе работы і наступных выданняў „Запісак" гэтыя недахопы будуць знішчаны, бо, як пісаў наш вялікі настаўнік Маркс—ззяючыя вяршыны вукі дасягаюцца толькі пасля ўпартай і доўгай працы.

**Рэдкалегія.**

**Увага.** У асноўным у „Вучоных запісках" будуць друкавацца работы навуковых працаўнікоў Віцебскага Ветэры нарна Зоатэхнічнага Інстытута, праведзеныя ў самым Інстытуце або на вытворчасці. Апрача таго, будуць друкавацца работы навуковых працаўнікоў Інстытута, праведзеныя імі за час прабывання ў другой ВНУ або НДІ. Пры папярэднім узгадненні з рэдкалегіяй у мэтах абмена навукова-даследчым вопытам у „Вучоных запісках" могуць змяшчацца таксама арыгінальныя, нідзе яшчэ не надрукаваныя навуковыя работы працаўнікоў іншых Ветзоатэхнічных ВНУ і НДІ, а таксама практычных працаўнікоў (ветурачоў і зоатэхнікаў), якія маюць тэарэтычнае або практычнае значэнне ў галіне ветэрынарыі і зоатэхнікі.

Адрас рэдакцыйнай калегіі: Віцебск, Ветэрынарна-Зоатэхнічны Інстытут, рэдакцыі „Вучоных запісак".

---

